# 2023 год

# ЮБІЛЕЙ ПЕРШАГА ВЫДАННЯ

Звесткі з архіва
Нацыянальнай кніжнай палаты Беларусі

*Кніга, як і чалавек, мае дату нараджэння – год, калі яна ўпершыню была апублікавана. І, канешне, у кніг бываюць юбілеі, а яны, як вядома, з’яўляюцца своеасаблівымі каталізатарамі ўспамінаў і служаць нагодай для таго, каб звярнуць увагу на выдатныя старонкі гісторыі літаратуры і кнігадрукавання і ўвогуле ацаніць «базу даных» культурнай спадчыны, асэнсаваць яе ўнікальнасць.*

*У гэтай рубрыцы прадстаўлена інфармацыя аб мастацкіх творах класікаў беларускай літаратуры, першыя выданні якіх захоўваюцца ў архіве Нацыянальнай кніжнай палаты Беларусі і для якіх 2023 год з’яўляецца юбілейным.*

## 75 гадоў

**Вітка, В. Вавёрчына гора / Васіль Вітка. – Мінск : Дзяржаўнае выдавецтва БССР, Рэдакцыя дзіцячай літаратуры, 1948. – 23 с.**




Вершаваная казка «Вавёрчына гора» – першы твор Васіля Віткі, напісаны для дзяцей у 1947 г. Да друку казка была падпісана 15.11.1948 і ў той жа год выдадзена асобнай кнігай у Дзяржаўным выдавецтве БССР. Тыраж першага выдання твора – 8 000 экзэмпляраў.

Другое асобнае выданне казкі адбылося ў 1952 г. у тым жа выдавецтве, але тыраж быў значна павялічаны і налічваў ужо 20 000 экзэмпляраў.

Пазней казка «Вавёрчына гора» выдавалася ў шматлікіх зборніках твораў аўтара.

# 75 гадоў : «Вавёрчына гора»



КАЗКА

Пра Веру-вавёрачку,
Пра яе гора-горачка,
Пра яе маленькіх дочак
Пра вавёрчын малаточак,
Пра птушынага пасла—
Доўганосага бусла,
Пра жыццё-быццё лясное
І яшчэ пра тое-сёе.



Забалелі ў вавёрачкі зубкі—
Не можа раскусіць арэхавай шкарлупкі.
Плача Вера-вавёрачка:
— Ой гора маё,
Горачка . . .

Сабралася ўся вавёрчына радня,
Думаюць, гадаюць усю ноч да дня:
Як тут быць,
Што рабіць?

Прыкладаюць дочкі
Мамачцы прымочкі,
Грэюць унучкі
Бабульцы анучкі.
Яшчэ болей баляць вавёрчыны зубкі—
Не можа крануць арэхавай шкарлупкі.

Вестку паслалі старэйшаму сыну,
Той адразу ўсе справы пакінуў

4



Сказалі сёстры брату:
— Навошта
Табе самому хадзіць
На пошту?
Мы самі знаем, дзе стары граб.
Даўно мы хацелі
Збегаць на тэле . . .
Даўно мы хацелі
На тэле-
Граф.
— Ну, што-ж, імчыце,—
Сказаў браток,—
Занясіце лісток,
Вазьміце квіток.

— Нясіце,—сказала мама,—
Каб сёння-ж
Дайшла тэлеграма.

6

Ілюстрацыі да першага выдання выканаў мастак-графік Дзмітрый Красільнікаў (1903–1951).

# 75 гадоў : «Вавёрчына гора»

Пра тое, як была напісана казка «Вавёрчына гора», Васіль Вітка (сапраўднае імя Цімох Васільевіч Крысько, 1911–1996) расказаў у гутарцы Уладзіміру Ліпскаму:

«Мая першая казка склалася ў 1947 годзе. А было так. Ехалі мы з малым сынам да бабулі ў вёску. Дарога далёкая ад Слуцка да Еўліч, кіламетраў пятнаццаць. Транспарту не было. І от мы, каб дарога стала лягчэйшай, пачалі адзін аднаму апавядаць казкі. Я прыгадаў усе, якія ведаў, а потым стаў складаць сваю пра вавёрачку, якая трапіла ў бяду. Складалі разам з сынам, потым з суседскімі дзецьмі. Тады я вырашыў напісаць яе ў вершах, бо вельмі ж падабаўся сюжэт. Ды і першыя слухачы — дзеці — уважліва слухалі, перажывалі за вавёрачку, у якой разбалеліся зубкі. Напісаў. А калі вярнуўся ў Мінск, адважыўся і пайшоў з казкай да Івана Міхайлавіча Маўра. Пачытаў ён і сказаў: «Добрая казка». Пасмялеўшы, я паказаў яе рэдактарам. Казку надрукавалі ў часопісе «Полымя». Наступную казку «Буслінае лета» напісаў… праз дзесяць гадоў».



# 75 гадоў : «Вавёрчына гора»

Якое ж гора здарылася ў казачнай Веры-Вавёрачкі? Ды самае звычайнае:

Забалелі ў вавёрачкі зубкі —
Не можа раскусіць арэхавай шкарлупкі.

Што толькі ні робіць радня, а дапамагчы вавёрачцы зняць боль не можа. Застаецца адно: зрабіць малаток, каб вавёрачка магла разбіваць арэшкі. Гэты малаток можа зрабіць каваль, але ён жыве далёка. І вось пра пошукі каваля, пра майстраванне малаточка, пра дастаўку яго хворай вавёрачцы, пра лясных і нелясных жыхароў, якія прыходзяць на дапамогу, і расказваецца ў казцы. У ёй ачалавечаны не толькі птушкі і звяры, а нават маланка, гром і дождж. Але ў казачнае аўтар уключае і рэальнае: гэта фашысцкі танк, ад якога засталася груда іржы, што ледзь удалося наскубсці з яго «шматок шэрсці» на «бранябойны» малаток... Як пісаў Алесь Бачыла, «захаваўшы знешнія асаблівасці казкі, Васіль Вітка напоўніў яе канкрэтнымі рэаліямі жыцця. Па іх мы можам дакладна вызначыць, што апісаныя ім падзеі адбываюцца ў пасляваенны час, калі яшчэ скрозь на палях валяліся рэшткі разбітай варожай тэхнікі, як сведчанне тае гераічнае бітвы, якую народ завяршыў слаўнай перамогай. Дасталася яна нялёгка. Аднак вялікае гора, перажытае ў вайне, не прытупіла людскога болю, не зрабіла людзей нячулымі да чужой бяды. Наадварот, загартаваныя мужнасцю, яны сталі больш душэўнымі, чулымі і спагадлівымі. І гэта вельмі хораша паказваецца ў казцы...».

# 75 гадоў : «Вавёрчына гора»

● У 1952 г. казка «Вавёрчына гора» была агучана на Беларускім радыё. Галоўныя ролі ў радыёпастаноўцы выканалі народны артыст СССР Глеб Глебаў і народная артыстка БССР Раіса Кашэльнікава. Іншыя ролі выканалі артысты мінскіх тэатраў. Запіс 1952 года можна паслухаць па спасылцы https://www.facebook.com/watch/?v=1602872409898770 .

● За свае цудоўныя казкі, якія захапляюць і сюжэтам, і жывым звонкім словам, і запамінальнымі вобразамі, Васіль Вітка быў уганараваны ў 1973 годзе тытулам «Найлепшы казачнік свету» і атрымаў прэстыжны і пачэсны Міжнародны дыплом імя Х.-К. Андэрсэна.